Выпускаецца ў абарачэнне паштовая марка з серыі «Дасягненні беларускай медыцыны»

17 чэрвеня 2021 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія» з серыі «Дасягненні беларускай медыцыны».
Дызайн А.Мядзведзь.
Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц.Непагодзіна».

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Кардыялогія» – вядучая лячэбная і навуковая ўстанова па аказанні кардыялагічнай і кардыяхірургічнай дапамогі ў Беларусі.
Утвораны ў 1977 г. як Беларускі навукова-даследчы інстытут кардыялогіі.
Удастоены прэстыжных узнагарод міжнароднага ўзроўню за значны ўклад у развіццё кардыялогіі і трансплантalогіі, за распрацоўку і выкарыстанне сучасных медыцынскіх тэхналогій і метадаў дыягностыкі і лячэння.
У аснове маркі і спецштэмпеля – лагатып рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія», у супрацоўніцтве з якім падрыхтаваны праект.

У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Source URL: *https://www.mpt.gov.by/news/16-06-2021-7248*